**Сенькавец У.А. (Брэст)**

# Філасофская аснова санета Максіма Багдановіча «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі…»

Адносіны М. Багдановіча да цвёрдых паэтычных жанраў і форм агульнавядомыя. Ён не толькі прапагандаваў іх сярод творцаў, але і выкарыстоўваў у якасці аргументаванага доказу пра неабмежаваныя магчымасці беларускай мовы культываваць лепшыя дасягненні еўрапейскай паэтыкі. Асаблівае стаўленне ў беларускага класіка было да санета як адной з самых распрацаваных і папулярных у сусветнай літаратуры жанравай формы. М. Багдановічу імпанавала ў санеце найперш яго філасофская сутнасць, узорная гармонія зместу і формы, вывераная дыялектычная стройнасць кампазіцыі. Санет, у адрозненне ад іншых паэтычных жанравых форм, мае свой спецыфічны змест: ён, перш за ўсё, прыстасаваны «для перадачы адчування дыялектыкі быцця» [5, с. 5]. Адсюль двухсастаўная кампазіцыйная будова твора, якая адрозніваецца сваім зместам і непаўторным фармальным малюнкам.

Унутраны драматызм санетнай формы быў заўважаны яшчэ ў канцы XVIII ст. нямецкім паэтам і крытыкам А.В. Шлегелем. Пазней на яго звярнуў увагу І. Бехер (трактат «Філасофія санета ці маленькае настаўленне па санету»), вызначыўшы санет як жанр не толькі драматычны, але і дыялектычны. Ён, на думку даследчыка, адлюстроўвае ўсе этапы жыцця чалавека, яго пачуццяў і думак. У пачатку твора, па меркаванні І. Бехера, даецца тэзіс, далей, цераз супрацьпастаўленне – антытэзіс – падаюцца высновы, якія сінтэзуюць тэзіс і антытэзіс. Менавіта гэтыя тры дыялектычныя фазы і вызначаюць дзяленне санета на два катрэны і два тэрцэты. У класічнай форме санета першы катрэн змяшчае тэзіс, другі – антытэзіс, і тэрцэты (секстэт) – сінтэз.

Значна раней за І. Бехера, у 1911 г., у артыкуле «Санет. Тэарэтыка-гістарычны нарыс» звярнуў увагу на адметнасць згаданай формы М. Багдановіч. Ён пераканальна даказаў неабходнасць строгага захавання фармальнай пабудовы санета, зыходзячы з дыялектычных прынцыпаў яго структуры. Санетам М. Багдановіч называе верш, які «складаецца з чатырнаццаці напісаных пяцістопным ямбам радкоў, у якіх мужчынскія рыфмы чаргуюцца з жаночымі і маюць такі парадак: AbbA AbbA ccDeDe» [2, с. 193]. Форму паэт лічыць асноўным, але не адзіным ядром санета, вакол якога групуюцца ўсе іншыя яго элементы. Зыходзячы з кананічнай рыфмоўкі, аўтар падкрэслівае, што санетная страфа падзяляецца на дзве асобныя часткі: васьмі- і шасцірадкоўі, якім уласціва як сэнсавая завершанасць, так і незалежнасць. «Калі ж бы ён (змест. – *У.С.*) перапляснуў за край уласнай формы, прарваў яе гаць і ўліўся ў межы другога кавалка, – пекнасць верша была б адразу папсавана; форма і змест яго зрабіліся б чужымі, непрыстасованымі, нязгоднымі, змагаючыміся між сабой, увесь час шкодзілі б адзін аднаму збудзіць у чытача пачуццё красы і нават забілі б яго» [2, с. 194]. Форма, на думку аўтара, не можа з‘яўляцца адзіным паказчыкам сапраўднага санета – толькі разам з адпаведна арганізаваным зместам яна ўтварае «паэтычны маналіт». Не менш важную ролю М. Багдановіч надае пытанню руху думкі: «У першых васьмі строчках развіваецца тэма санету, а ў астатніх – заключэнне да яе; ставіцца пытанне і даецца адказ; малюецца абразок і выкладаецца паясненне к яму» [2, с. 194].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аднак сапраўдны паэт – не сляпы паслядоўнік канона, а яго творца. «Эксплуатацыя агульнапрынятай формы, – сцвярджае А. Разанаў, – адкрывае шлях да версіфікатарства. А паэзія – жывы арганізм… Разняволенне верша – гэта, у прынцыпе, разняволенне духоўнага свету чалавека, гэта шлях чалавека з палону стэрэатыпаў» [4, с. 24]. Менавіта таму можна знайсці тлумачэнне самым разнастайным санетным формам, у тым ліку і так званым «хвастатым», «перавернутым», «безгаловым», «кульгавым» і інш. Тым не менш яны – антыномы, выключэнні, якія могуць быць апраўданы толькі ў тым выпадку, калі паэт звяртаецца да іх не дзеля штукарства, а зыходзячы з патрабаванняў зместу.

Трактаваць санет як філасофскую з’яву можна, маючы на ўвазе толькі яго кананічны прататып. «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі…») – яркі гэтаму прыклад. У ім паэт падымае пытанні, якія будуць пазней вырашацца ў манументальных паэмах Я. Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка», у драме Я. Купалы «Раскіданае гняздо», вершах А. Гаруна, прозе М. Гарэцкага і інш. За аснову санетнага «абразка» М. Багдановіч бярэ факт, апісаны прафесарам А. Пагодзіным: «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі, / Над хвалямі сінеючага Ніла, / Ўжо колькі тысяч год стаіць магіла: / Ў гаршку насення жменю там знайшлі» [1, с. 137]. Мелодыка прыведзенага чатырохрадкоўя стрыманая, знешне яна носіць інфарматыўны характар. У далейшым тэма істотна паглыбляецца: «Хоць зернейкі засохшыя былі, / Усё ж такі жыццёвая іх сіла / Збудзілася і буйна ўскаласіла / Парой вясенняй збожжа на раллі».

Апошнія катрэнныя радкі санета эмацыянальна ўзрушваюць. Прыведзены факт успрымаецца не толькі рацыянальна – ён выклікае радасна-ўстрывожаныя пачуцці хвалявання: праз столькі вякоў зерне захавала сваё жыццё, яно прарасло. Інтанацыя ў гэтым месцы дасягае свайго найбольшага ўздыму. Першая частка санета завяршаецца. Сведчанне гэтаму – не толькі змястоўная акалічнасць, але і фармальна-структурная: катрэны замяняюцца на тэрцэты, з’яўляецца іншая рыфмоўка. М. Багдановіч пра асаблівасць рыфмоўкі абедзвюх частак пісаў: «Мы бачым, што першыя восем строк санета скаваны між сабой ланцугом адзінакавых рыфм, знітаваны імі ў нешта цэльнае, звернуты ў нейкі паэтычны маналіт, а каб гэтая знітоўка была мацнейшай, каб пачатак верша не расслаіўся на два зусім незалежных куплеты, – канец першага з іх і пачатак другога маюць адзінакавыя рыфмы. Стаячыя ж далей ужо новыя рыфмы павінны зрабіць глыбокую трэшчыну паміж гэтым кавалкам і ўсім астатнім. Значыцца, санетная форма распадаецца на дзве асобныя часці, што *вымагае і ад зместу* кожнай з іх як *скончанасці*, так і *незалежнасці* (вылучана аўтарам. – *У.С.*)» [2, с. 193].

У шасцірадковай частцы санета раскрываецца «красамоўная сімволіка» (А. Лойка) неўміручасці народнага духу, разбуджанага вызваленча-рэвалюцыйнымі падзеямі пачатку XX ст.: «Вось сімвал твой, забыты краю родны! / Зварушаны нарэшце дух народны, / Я верую, бясплодна не засне, / А ўперад рынецца, маўляў, крыніца, / Каторая магутна, гучна мкне, / Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца» [1, с. 137].

У прыведзеных радках аўтар асэнсоўвае лёс народа, які стагоддзямі імкнуўся да свабоды і шчасця, незалежнасці і святла. У санеце ёсць і «празрыстыя алюзіі, намёкі на тое, – заўважае Р. Бярозкін, – што было для

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

чытача памятным учарашнім ці нават сённяшнім днём. «Зварушаны нарэшце дух народны» – ці не 1905 год маецца тут на ўвазе? А вера, што гэты дух «бясплодна не засне», – ці гэта не водгук на вельмі канкрэтныя абставіны паслярэвалюцыйнай рэакцыі?» [3, с. 104]. Аргументам для сцвярджальнага адказу на пастаўленыя Р. Бярозкіным пытанні могуць служыць словы самога М. Багдановіча, які назваў 1905 г. вехай, што «адзначае пункт пералому ў гісторыі беларускага адраджэння. Падзеі, што звязаны з гэтым годам, стварылі ў народных масах імкненне разабрацца ў навакольным жыцці і выклікалі ліхаманкавы попыт на ідэалагічныя каштоўнасці» [2, с. 274].

Своеасаблівае, арыгінальнае гучанне тэрцэтнай часткі Багдановічава санета: інтанацыйны малюнак мяняецца тут у строгай адпаведнасці са зместам. Кульмінацыйныя радкі верша («Зварушаны нарэшце дух народны, / Я верую, бясплодна не засне»), дзякуючы прыёму антытэзы (дух народны не засне, а ўперад рынецца) і найбольшай насычанасці ненаціскнымі стопамі – пірыхіем, а таксама строга класічнай рыфмоўцы, гучаць нетаропка, акцэнтуючы ўвагу на кожным слове. Асаблівае напружанне інтанацыі адчуваецца ў апошнім трохрадкоўі – санетным замку, дзе выказана галоўная думка ўсяго твора. Найбольш значны ён і ў мастацка-вобразным плане: народны дух прыпадабняецца М. Багдановічам да магутнай крыніцы, якая з падземных глыбінь вырвалася на прастор. Больш за тое, апошняе слова Багдановічава санета *прабіцца,* згодна з класічнымі традыцыямі, з’яўляецца сэнсавым «ключом» да ўсяго твора, таму і мелодыка заключнага радка нарастае, дасягнуўшы свайго апагею, узвышэння на «ключавым» слове. Тэза і антытэза, як бачым, у санеце не толькі самастойныя кампазіцыйныя элементы са сваім зместам і формай, але і непадзельныя кампаненты аднаго цэлага – усяго твора, аб’яднаныя скразной аўтарскай думкай.

«Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»), такім чынам, з’яўляецца яркім узорам чыста кананічнай формы верша ў беларускай літаратуры пачатку XX ст., у якім паэт строга вытрымлівае ўсе класічныя фармальна-структурныя патрабаванні, падкрэслівае яго глыбокую філасофскую сутнасць.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 1993.
3. Бярозкін, Р. Чалавек напрадвесні / Р. Бярозкін. – Мінск, 1986.
4. «Паэзія ў спасціжэнні паэзіі…» (дыялог крытыка і паэта – Тамары Чабан і Алеся Разанава) // З апокрыфа ў канон : гутаркі, выступленні, нататкі / А. Разанаў. – Мінск, 2010.– С. 14–25.
5. Плавскин, З.И. Четырнадцать магических строк / З.И. Плавскин // Западноевропейский сонет. – Л., 1988. – С. 3–28.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ